ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЕДНАЦЕСЯ!

# ЧЫРВОНАЯ ЗВЯЗДА

ОРГАН КОСАЎСКАГА РК КП(б) БЕЛАРУСІ І ВЫКАНКОМА РАЙСОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ.

№ 18 (38) Аўторак 1 мая 1945 г.

## НЯХАЙ ЖЫВЕ 1-е МАЯ, ДЗЕНЬ АГЛЯДУ БАЯВЫХ СІЛ ПРАЦОЎНЫХ!

## ВЯЛІКАЕ СВЯТА

Сёння 1-га мая—дзень агляду баявых сіл працоўных. З вялікай гордасцю, са свядомасцю свята выконваемага доўга перад Радзімай прышоў совецкі народ да першамайскага свята.

Ужо чацверты раз народы нашай Радзімы сустракаюць 1-е мая ва ўмовах Айчыннай вайны супроць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Чырвоная Армія, прайшоўшы цяжкі шлях суровых баёў з ворагам, назаўсёды ачысціла нашу совецкую зямлю ад нямецка-фашысцкай погані, уступіла на тэрыторыю Германіі і дабівае фашысцкага звера ў яго ўласным логаве.

З вялікімі поспехамі сустракаюць 1-е мая труджанікі совецкага тыла. Магутная совецкая прамысловасць дае для Чырвонай Арміі неабходную колькасць узбраення, знараджэння і боепрыпасаў. Соцыялістычная сельская гаспадарка поўнасцю забяспечвае армію і рабочы клас прадуктамі харчавання, а прамысловасць—сыравінай.

Працоўныя нашага раёна, як і ўвесь беларускі народ, сустракаюць 1-е мая ў упартай барацьбе за хутчэйшае заканчэнне веснавой сяўбы, за поўнае аднаўленне разбуранай народнай гаспадаркі. Сяляне і сялянкі раёна, перажыўшыя пакутныя годы чорнай нямецкай акупацыі, усю сілу гнева і помсты укладваюць у працу, дапамагаюць Чырвонай Арміі хутчэй расправіцца з ворагам. План сяўбы ранніх яравых культур па раёну ужо выканан на 101.5 проц. Хуткімі тэмпамі разгортваецца сяўба бульбы, тэхнічных і позніх зернавых культур.

Зараз задача заключаецца ў тым каб на базе шырокага соцыялістычнага спаборніцтва, дабіцца поўнага выканання плана веснавой сяўбы, арганізаваць добры догляд за пасевамі і дабіцца высокага ураджаю—ураджаю перамогі.



СЛАЎСЯ, АЙЧЫНА ТЫ
НАША СВАБОДНАЯ,
ШЧАСЦЯ НАРОДАЎ
АПОРА І МОЦ!
СЦЯГІ СОВЕЦКІЯ, СЦЯГІ
НАРОДНЫЯ
ХАЙ НАС ВЯДУЦЬ
ПА ШЛЯХУ ПЕРАМОГ!

## ДОШКА ПАЧОТА

Пастановай РК КП(б) Беларусі і Выканкома райсовета дэпутатаў працоўных ад 30 красавіка г.г. на раённую Дошку Пачота заносяцца наступныя сяляне і упаўнаважаныя сельскіх советаў, якія выканалі план сяўбы ранніх зернавых культур і аказалі дапамогу бясконным гаспадаркам.

12. ГАЛАБУРДА АПАНАС НІКАЛАЕВІЧ, упаўнаважаны Выканкома Альбінскага сельсовета ў в. Жэмайдзякі, які арганізаваў дапамогу ў сяўбе ўсім бясконным гаспадаркам, у выніку чаго вёска поўнасцю выканала план сяўбы ранніх зернавых культур.

13. ПОПКА ІВАН ГАРДЗЕЕВІЧ, упаўнаважаны Выканкома Бусяжскага сельсовета ў в. Рапкевічы, які ўмела арганізаваў дапамогу 60 бясконным гаспадаркам, у выніку чаго вёска выканала план сяўбы раніх зернавых культур.

14. БУРЫН ЗАХАР ВАСІЛЬЕВІЧ, сялянін вёскі Сакоўцы Бусяжскага сельсовета, які выканаў план сяўбы ранніх зернавых і аказаў сваім канём дапамогу ў сяўбе 6-ці бясконным гаспадаркам.

## У ВЫКАНКОМЕ РАЙСОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ І РК КП(б)Б

Выканком райсовета дэпутатаў працоўных і РК КП(б) Беларусі разгледзелі ход соцыялістычнага спаборніцтва паміж сельсоветамі ў правядзенні веснавой сяўбы па становішчу на 30 красавіка г.г. і пастанавілі аставіць пераходны Чырвоны Сцяг у Яблонскім сельсовеце (старшыня сельвыканкома тав. Барсук), які ў соцыялістычным спаборніцтве ўтрымаў за сабой першае месца ў раёне, выканаўшы план веснавой сяўбы на 104, 8 проц. Другое месца ў соцыялістычнм спаборніцтве заняў Любішчыцкі сельсовет (старшыня сельвыканкома т. Касавец), які выканаў план веснавой сяўбы на 90 проц. і трэцяе—Стайкаўскі сельсовет (старшыня сельвыканкома т. Кулецкі), які выканаў план веснавой сяўбы на 80,5 процантаў.

## Пад сцягам Леніна, пад вадзіцельствам Сталіна—уперад за канчатковы разгром гітлераўскай Германіі, за поўную перамогу нашай правай справы!

### Май

Да нас у госці май прыходзіць,
Як не прыходзіў у вяках,
Спявае песні аб свабодзе
На полі, ў моры, ў руднiках.

Спявае дзецям калыханкі,
Прыгожыць кветкамі сады,
Вядзе сялянаў і сялянкаў
На шлях шчаслівы, малады.

Прыходзіць май зялёны ў госці,
А з падарункамі ідзе,
Уцеху буйнай сыпе горсцю
Святочна ўбранай грамадзе.

Янка Купала.

### ДРУЖНАЯ ПРАЦА

Дружна ідзе праца на палях Яблонскага сельсовета. Дзякуючы добра арганізаванай узаемадапамозе бясконным гаспадаркам, сельсовет дабіўся першынства ў сацыялістычным спаборніцтве і ўжо другую пяцідзёнку трымае пераходны Чырвоны Сцяг Выканкома райсовета дэпутатаў працоўных і РК КП(б) Беларусі.

У сельсовеце ёсць выдатныя людзі, сапраўдныя барацьбіты за датэрміновае выкананне плана веснавой сяўбы. Упаўнаважаны Выканкома сельсовета ў в. Воля Кузміцкі Александр Фёдаравіч паставіў сваю работу так, што ўсе бясконныя гаспадаркі вёскі дзякуючы ўмела арганізаванай ім дапамогі выканалі план сяўбы зернавых культур. Тав. Кузміцкі асабіста дапамог пасеяць 5-ці бясконным гаспадаркам.

Добра працуе і ўпаўнаважаны Выканкома сельсовета ў в. Бараны Мультан Валенціна Міхайлаўна. Сяляне вёскі Бараны поўнасцю пасеялі раннія зернавыя культуры, прыступілі да сяўбы бульбы і тэхнічных культур, рыхтуюць глебу пад больш познія зернавыя.

Сяляне сельсовега з вялікай радасцю адзначаюць дзень 1-га мая. Перамогі гераічнай Чырвонай Арміі якая дабівае нямецкага звера, натхняюць кожнага сяляніна, кожную сялянку на яшчэ большыя працоўныя подвігі ва славу сваёй Радзімы.

А. Яравы.

### ВОЛЬНЫ МАЙ

Сёнешні дзень асабліва радасны для нас дзень. Больш трох год мы не мелі магчымасці свабодна адзначаць дзень першага мая. Нямецкія мракабесы, акупіраваўшы тэрыторыю нашай роднай Беларусі, стараліся задушыць у нашым народзе ўсё жывое і разумнае.

Сяляне нашай вёскі ніколі не забудуць і не даруюць фашысцкім палачам за пакутную смерць 26 нашых аднасяльчан. Іхняя кроў заклікае нас да помсты, да яшчэ большай працы на карысць нашай дарагой радзімы.

Сёння дзень 1-га мая. Вольнымі і шчаслівымі грамадзянамі адзначаем мы гэты дзень. Радуючыся сонцу, святлу, нашай вялікай урачыстасці, мы ніколі не забываем, што свабоднае жыццё, вольны май, радасць і шчасце мы атрымалі з рук нашай слаўнай Чырвонай Арміі, якая назаўсёды вызваліла нас ад нямецка-фашысцкага ярма.

Рыхтуючыся да Першага мая сяляне нашай вёскі ўзмацнілі тэмпы сяўбы. І наша вялікае свята мы сустракаем поўным заканчэннем сяўбы зернавых культур. Акрамя гэтага на палях вёскі распачалася інтэнсіўная сяўба бульбы і тэхнічных культур. Сяўбу і гэтых культур мы пастараемся правесці ў самы сціслы тэрмін.

У гэту вясну, як ніколі, назіраецца творчая ініцыятыва нашых людзей. Асабліва яна выдзяляецца ва ўзаемадапамозе друг другу. Пасеяць больш і лепш — лозунг кожнага сяляніна і сялянкі. Добра ў нашай вёсцы дапамагаюць бясконным сялянам Калеснік Павел, Радзюк Сяргей, Радзюк Іван і др. Кожны сваёй добрасумленнай працай, актыўнай дапамогай сям'ям франтавікоў, стараецца ўнесці яшчэ большы уклад у справу перамогі над ворагам.

Першае мая нашы людзі святкуюць з упэўненасцю ў нашай хуткай і канчатковай перамозе над ворагам і што ніхто больш не памяшае нам будаваць сваё шчаслівае, вольнае жыццё.

С. Паўловіч, упаўнаважаны Выканкома Грыўдзенскага сельсовета ў вёсцы Дубітава.

### Наша радасць

Вялікімі перамогамі сустракае наша краіна ўрачысты дзень Першага мая. Воіны Чырвонай Арміі акружылі сталіцу фашысцкай Германіі—Берлін і вядуць баі па знішчэнню засеўшага там варожага гарнізона. Войскі Чырвонай Арміі злучыліся з войскамі нашых саюзнікаў і разрэзалі германскі фронт на дзве часткі. Савецкі тыл разам з фронтам куе перамогу над ворагам.

Наша вёска Галынка сустракае Першае мая з вялікімі поспехамі. Закончана сяўба зернавых яравых культур, поўным ходам ідзе сяўба бульбы, тэхнічных культур і агародніны. Адчуваючы свой доўг перад радзімай і ў падзяку Чырвонай Арміі за сваё вызваленне, сяляне вёскі прыкладаюць усе сілы, каб пасеяць чым больш, атрымаць высокі ўраджай і даць краіне і фронту больш хлеба, бульбы і другіх прадуктаў.

Сёння дзень 1-га мая. Радасці нашай няма канца. Мы дзякуем вялікаму Сталіну за атрыманую магчымасць свабодна працаваць, адзначаць нашы ўрачыстасці, жыць сапраўдным жыццём.

Прыкладзем усе сілы на хутчэйшае выкананне плана веснавой сяўбы.

Д. Касперовіч, сялянін в. Галынка Бусяжскага сельсовета.

# ЗА ЯШЧЭ БОЛЬШЫЯ ПОСПЕХІ Ў ВЕСНАВОЙ СЯЎБЕ

С. Зорын,
заг. райземаддзела.

У абстаноўцы вялікіх гістарычных перамог Чырвонай Арміі сустракае савецкі народ першамайскія ўрачыстасці. Набліжаецца час канчатковага разгрома ворага, поўнае тар жаство доўгіх ваенных намаганняў нашага народа і ўсіх Аб'еднаных нацый.

Радуючыся добрым звесткам з франтоў, савецкі народ працуе не пакладаючы рук. Ён ведае, што чым больш упартая праца, тым бліжэй канчатковая перамога.

Працоўнае сялянства нашага раёна сустракае першамайскае свята ў барацьбе за паспяховае выкананне плана веснавой сяўбы, за атрыманне ў гэтым годзе высокага ўраджаю. Асабліва напружана ішла праца на палях раёна ў прадмайскія дні. Сяляне і сялянкі з нябачаным натхненнем уносяць свой уклад ва ўсенародную справу перамогі. На 27 красавіка план сяўбы ранніх зернавых культур у раёне выканан на 101,5 проц. Сяўба праведзена за 12 рабочых дзён. Акрамя гэтага ў раёне пасеяна 350 га. бульбы, 226 га тэхнічных культур, 12 гектараў гародніны і 228 гектараў падпакроўных пасеваў.

Гэтыя поспехі заваёваны нашымі сялянамі ўпартай, настойлівай працай, актыўнай і добрасумленнай дапамогай сем'ям воінаў Чырвонай Арміі, партызан і бясконным бядняцкім гаспадаркам. Дастаткова правесці такі факт, што за час сяўбы ранніх культур у раёне аказана цягавай сілай дапамога 2600 бясконным, якім узарана 2295 га. і засеяна 2414 га, 620 гаспадарак франтавікоў, партызан, а таксама бядняцкіх гаспадарак атрымалі дапамогу насеннем у колькасці 32676 кілаграм.

Акрамя гэтага вялікая дапамога бясконным аказваецца з боку Івацэвіцкай МТС. Трактарамі і конямі МТС аказана дапамога 170 бясконным гаспадаркам, узарана і засеяна 183 гектары.

Социялістычнае спаборніцтва, якое шырока разгарнулася на веснавой сяўбе паміж сельсоветамі і вёскамі паслужыла вялікім стымулам для нашых сялян за хутчэйшае і добраякаснае правядзенне сяўбы. Сяляне Яблонскага сельсовета, заваяваўшы першынство ў социялістычным спаборніцтве, датэрмінова выканалі план сяўбы ранніх зернавых культур і прыступілі да масавай сяўбы бульбы і тэхнічных. Жадаючы яшчэ больш дапамагчы сваёй вызваліцельніцы—Чырвонай Арміі, яны рашылі засеяць 10 гектараў у фонд абароны Радзімы. Паспяхова праходзіць сяўба бульбы і тэхнічных у Стайкаўскім, Любішчыцкім і Гошчаўскім сельсоветах.

1-е мая сяляне нашага раёна адзначаюць ва ўрачыстай і радаснай абстаноўцы. З гордасцю за сваю радзіму, за гераічную Чырвоную Армію прадэманстрыруюць яны сваю адданасць партыі Леніна-Сталіна, совецкаму ўраду і вялікаму правадыру народаў таварышу Сталіну.

Адзначаючы наша вялікае свята, мы яшчэ больш павінны памятаць аб тых вялікіх задачах, якія стаяць перад намі. Самая важная з іх—паспяховае заканчэнне сяўбы ўсіх культур. Мы павінны яшчэ шырэй разгарнуць социялістычнае спаборніцтва, яшчэ лепш арганізаваць узаемадапамогу бясконным. Чым хутчэй і лепш сельсовет, вёска, кожная сялянская гаспадарка закончаць веснавую сяўбу, тым большую дапамогу яны акажуць Радзіме і фронту.

## Патрыёт радзімы

Сялянін вёскі Руда Сенькавіцкага сельсовета Бульскага Канстанціна ведае ўвесь раён. У зімні перыяд ён самааддана працаваў на лесавывазцы і выконваў дзённыя нормы на 120—150 проц.

Зараз тав. Бульскі не пакладаючы рук працуе на полі. Дадзены яму план сяўбы зернавых культур ён поўнасцю выканаў. Акрамя гэтага ён апрацаваў сваім канём і пасеяў зернавыя культуры тром чырвонаармейкам, дапамагае многім другім бясконным.

Таварыш Бульскі сапраўдны патрыёт сваёй радзімы. Гэта ён даказаў на справе. Па таварышу Бульскаму павінны раўняцца ўсе сяляне раёна.

З. Барынава.

## ПАВЫШАЮЦЬ ВЫТВОРЧАСЦЬ ПРАЦЫ

Рабочыя дубітаўскага падучастка Івацэвіцкага хімлесгаса прыйшлі да дня 1-га мая са значнымі вытворчымі поспехамі. Па асноўных галінах вытворчасці праграма не толькі выканана, але і правыканана.

Добра працуюць рабочыя бандарнай майстэрні т. т. Паўловіч, Кулініч Нікалай, Кулініч Антон і др. Яны зрабілі 140 бочак для жывіцы.

Выдатных поспехаў на падсочцы жывіцы дабіліся Каленсік Владзімір, Каспяровіч Надзя, Бурын Марыя, Герман Ольга. Яны штодзённа перавыконваюць устаноўленыя нормы.

Паспяхова ідзе выраб такіх дробных, але неабходных дэталяў, як крампоны, і кастылі. Так крампонаў зроблена на 5 тысяч больш, а кастылёў—на 3 тыс. На тры тысячы звыш плана вытварана акорка сосен.

У адказ на гістарычныя поспехі Чырвонай Арміі рабочыя падучастка з кожным днём яшчэ больш павышаюць вытворчасць працы.

В. Кулецкі, майстар падучастка.

## ПЕРАДАВЫЯ ТРАКТАРЫСТЫ

З добрымі вынікамі працы сустракаюць 1-ае мая трактарысты т.т. Трэцяк і Гладун. Працуючы на трактары «Ольпуль» у Стайкаўскім і Любішчыцкім сельсоветах, яны з пачатку вясенне-палявых работ узаралі 50 га. зямлі (замест 43 га.).

Сяляне, чыё поле апрацоўваюць трактарысты Трэцяк і Гладун дзякуюць совецкую ўладу за аказаную дапамогу.

Паўлоўскі, дырэктар Івацэвіцкай МТС.

## Дзяржаўная дапамога сем'ям франтавікоў і партызан

Вялікімі клопатамі і ўвагай акружаны сем'і франтавікоў і партызан у нашай краіне. Партыя, савецкі ўрад і асабіста таварыш Сталін прыдаюць гэтаму пытанню вялікае значэнне.

З часу вызвалення нашага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў савецкая ўлада аказала і аказвае значную дапамогу сем'ям воінаў Чырвонай Арміі і партызан. 1400 сямей ваеннаслужачых і партызан атрымалі за гэты перыяд дзяржаўную дапамогу на суму 562.262 рублі. Акрамя гэтага многія сем'і франтавікоў і партызан атрымалі дапамогу хлебам, бульбай і другімі прадуктамі на агульную колькасць у 38.810 кілаграм. 14 сямей франтавікоў атрымалі адначасовую дапамогу на суму 3.600 рублёў.

У сувязі з тым, што многія вёскі і асобныя гаспадаркі ў раёне поўнасцю спалены немцамі, вялікая ўвага ўдзяляецца будоўлі новых дамоў. Для гэтай мэты савецкай уладай бясплатна адпушчана 7.500 кубаметраў лесу і ў першую чаргу сем'ям франтавікоў і партызан. Ужо пабудавана 538 новых дамоў. 657 сем'ям воінаў Чырвонай Арміі і партызан прадастаўлены кватэры.

**Сцёпкін, заг. аддзела дзяржаўнага забеспячэння Выканкома райсовета дэпутатаў працоўных.**

## Вынікі Соцыялістычнага спаборніцтва прадпрыемстваў Райпромкамбіната

Падведзены вынікі прадмайскага соцыялістычнага спаборніцтва прадпрыемстваў райпромкамбіната.

Першае месца заняў калектыў будаўнікоў Любішчыцкага паравога млына ( заг. млына т. Жыгар), які 27 красавіка закончыў усе будаўнічыя работы. Млын пушчан у ход.

Другое месца заняла ліцейная майстэрня (майстар т. Дзікан), выканаўшая месячны план на 230 проц.

Трэцяе месца заняла сапожная майстэрня (заг. т. Мароз), якая выканала месячны план на 225 процантаў.

Адзначаны добрыя вынікі работы жасцянай майстэрні (майстар Лукоўскі), выканаўшай план на 170 проц. і кузні (майстар Багдусевіч) выканаўшай план на 160 проц.

## Зводка

### ВЫКАНАННЯ ПЛАНА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ ПА СЕЛЬСОВЕТАХ РАЁНА НА 30 КРАСАВІКА ПА ДАНЫМ РАЙЗО.

| № п-п | Назва сельсоветаў | Усяго засеяна яравых у процантах | У тым ліку: Бульбы ў процантах | У тым ліку: Тэхнічных у процантах |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Яблонскі | 104,8 | 92,5 | 101,9 |
| 2. | Любішчыцкі | 90 | 83,3 | 103,4 |
| 3. | Стайкаўскі | 80,5 | 14,3 | 103,3 |
| 4. | Альшавіцкі | 77,9 | 16,8 | 70,7 |
| 5. | Падстарыньскі | 75,8 | 25,2 | 150 |
| 6. | Альбінскі | 74,7 | 6,3 | 66,6 |
| 7. | Белавіцкі | 72,4 | 52,2 | 85,7 |
| 8. | Грыўдзенскі | 69,6 | 22,1 | 54,5 |
| 9. | Сенькавіцкі | 64,5 | 9,7 | 90,1 |
| 10. | Гошчаўскі | 61,5 | 4,13 | 112,1 |
| 11. | Касаўскі | 60 | 38 | 20 |
| 12. | Івацэвіцкі | 58,9 | — | — |
| 13. | Жытлінскі | 58,6 | 7,7 | 100 |
| 14 | Яглевіцкі | 56,7 | 35,6 | 136 |
| 15. | Бусяжскі | 50 | 3,7 | 21,9 |

## Новы млын

З радасцю адзначае першамайскія ўрачыстасці калектыў будаўнікоў любішчыцкага паравога млына. 27 красавіка ў чэсць вялікага свята—1-га мая—млын пушчан у ход. Яго вытворчая магутнасць разлічана на перапрацоўку трох тон зярна ў суткі. Пры млыне працуе сталярная майстэрня.

На будаўніцтве млына асабліва вызначыліся сталяры Бахур Якаў, Каляда Васіль, мельнікі Саўчук Іван, Кулік Максім, машыніст Саханька Рыгор і др. уключыўшыся ў прадмайскае соцыялістычнае спаборніцтва ў апошні месяц яны працавалі не пакладаючы рук, змагаліся за хутчэйшае заканчэнне будаўніцтва.

Вялікую практычную дапамогу аказаў майстар мельнік Косаўскага млына т. Сухадольскі.

**К. Жыгар, заг. млына.**

## КОРАТКА

Працоўныя раёна адзначылі 75-годдзе з дня нараджэння В. І. Леніна. Ва ўсіх сельсоветах былі прачытаны даклады аб жыцці і дзейнасці Владзіміра Ільіча Леніна.

* * *

За 6 месяцаў з дня пуску ў ход Бусяжскі вадзяны млын перапрацаваў 60 тон зярна. Зараз вытворчасць млына павялічылася яшчэ больш. У суткі ён перапрацоўвае звыш 3-х тон зярна. Пры млыне ўстаноўлена крупадзёрка.

* * *

Новая лазня пабудавана ў вёсцы Куляшы Альбінскага сельсовета. З часу вызвалення ў сельсовеце пабудаваны 4 лазні.

* * *

Раённы дарожны аддзел прыступіў да абсадкі дрэвамі асвоўных грунтовых дарог раёна. Абсадка вытвараецца па дарогах Косаў—Бусяж, Косаў—Грыўда.

* * *

Драматычны гурток Куляшоўскай комсамольскай арганізацыі падрыхтаваў п'есу «Масква». П'еса будзе пастаўлена на першамайскія святы.

* * *

16 гектараў зямлі ў фонд Чырвонай Арміі засеялі комсамольцы скуратоўскай, гошчаўскай і серадаўскай пярвічных комсамольскіх арганізацый.

Адказны рэдактар **А. П. Рудой**

Г Л 15259

Адрас рэдакцыі: Косаў, вул. Максіма Горкага 106